ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

# Выхаванне патрыятызму праз музейную педагогіку

**Адной з галоўных задач выхавання, абазначаных у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі.**

На падставе гэтага асноўным напрамкам выхаваўчай работы ўстановы адукацыі з'яўляецца грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры, асабліва напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Музеі Беларусі валодаюць вялікім патэнцыялам у галіне захавання, вывучэння і папулярызацыі культурнай спадчыны, а таксама трансляцыі беларускіх маральна-этычных каштоўнасцяў і арыенціраў падрастаючаму пакаленню, што з'яўляецца неад'емным напрамкам грамадзянска-патрыятычнага выхавання. З гэтай мэтай у музеях ажыццяўляецца экспазіцыйна-выставачная, культурна-адукацыйная, фондавая, навукова-даследчая, рэстаўрацыйная і іншыя віды дзейнасці.

Першым у свеце музеем, прысвечаным самай кровапралітнай вайне XX стагоддзя, з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які ўжо 22 кастрычніка 1944 г. расчыніў свае дзверы перад наведвальнікамі. Зараз у музеі на плошчы больш за 3 тыс. $м^2$ можна ўбачыць звыш 8 тыс. экспанатаў, у тым ліку і ў фармаце віртуальнага тура. На свае вочы паглядзець на экспазіцыю кожны год прыходзяць каля 570 тыс.чалавек. Музей стаў скарбніцай ведаў для тых, хто жадае і ўмее здабываць мудрыя ўрокі з мінулага. Гэты аб'ект быў і заўсёды будзе месцам народнай памяці.

Значнае месца ў патрыятычным выхаванні моладзі займае філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Яго дзейнасць накіравана на асвятленне найважнейшых падзей у гісторыі незалежнай Беларусі.

Музейная педагогіка – гэта комплекс адукацыйных і выхаваўчых мерапрыемстваў, якія прымяняюцца на практыцы, засноўваюцца на ўсебаковым выкарыстанні матэрыялаў школьнага музея (экспазіцый, архіўных і гістарычных экспанатаў і дакументаў і г. д.), уключаючы ўсе формы краязнаўства. Школьнае краязнаўства і музеязнаўства – важныя фактары выхавання моладзі, якія садзейнічаюць развіццю пазнавальных інтарэсаў, далучэнню вучняў да творчай дзейнасці, фарміраванню практычных і інтэлектуальных ведаў, уменняў, навыкаў.

Мяняецца эпоха. Літаральна на вачах імкліва паскараецца тэмп жыцця, з'яўляюцца новыя тэхналогіі, моладзь становіцца больш прасунутай, усе працэсы праходзяць дынамічней. Але застаецца нязменнай жыццёвая каштоўнасць любой дзяржавы – патрыятызм яе грамадзян, які пачынаецца з любові да сваёй малой радзімы, да таго месца, дзе ты нарадзіўся і вырас, з гонару за сваю сям'ю, школу, вёску, пасёлак ці горад, за людзей, якія жывуць побач.

Важна разумець, што пакаленне, якое нарадзілася ў незалежнай Беларусі, нясе асаблівую адказнасць за развіццё грамадства, пераемнасць пакаленняў, росквіт Радзімы. Яно павінна праяўляць патрыятызм сваімі справамі, перамогамі ў працы, спорце і творчасці, навуковых дасягненнях, імкнучыся быць годнымі прадаўжальнікамі тых, каму ў страшныя гады Вялікай Айчыннай вайны прыйшлося на справе абараняць кожную пядзю роднай зямлі.

**Г.А. СМАЛЯНКА,**
**ст. выкладчык кафедры практычнай лінгвістыкі**
**Вікторыя ПРУДНІК, (25ім, 3 курс, ФПУ)**
**Паліна САУЛЬ, (25ім, 3 курс, ФПУ)**